*Н. В. Заяц*

# КУПАЛІЯНА ВАСІЛЯ ЗУЁНКА

У мастацка-вобразным свеце Васіля Зуёнка асоба нацыянальнага класіка займае асаблівае месца, паўстае сімвалам выключнага паэтычнага таленту, узорам грамадзянскага служэння. Прысутнасць Купалы ў аўтарскім тэксце выяўляецца праз актыўнае ўвядзенне “чужога слова” – выкарыстанне цытат, гістарычных і літаратурных алюзій, рэмінісцэнцый, эпіграфаў. Праблемна-тэматычны дыяпазон твораў купаліяны В. Зуёнка дастаткова шырокі: зварот да спадчыны класіка ажыццяўляецца ў вершах на тэму мастака і мастацтва (“Я часта непакоюся ў журбе...”, “Як сам Купала раіў...”, “Разнарадка”, “Дзеяслоўная рыфма”), заняпаду вёскі (“Уцякалі з вёскі маладыя...”), у жартоўна-іранічных самарэфлексіях (“Праблема Зуёнка”) і – найбольш паслядоўна – у творах грамадзянскай лірыкі, дзе даследуецца стан краіны ў перыяд духоўна-сацыяльнага хаосу мяжы тысячагоддзяў (праблемы гістарычнага бяспамяцтва, нацыянальнай непраяўленасці, бязмоўнасці народа).

Разважаючы пра сучаснасць, В. Зуёнак ажыццяўляе экскурсы ў мінулае, спрабуе знайсці вытокі сённяшніх праблем, прасачыць заканамернасці гістарычных паваротаў, іх уздзеянне на жыцці выключных прадстаўнікоў інтэлігенцыі (не толькі айчыннай), на Беларускі Шлях. Так, у вершы “Лесвіцы Чорная рэчка...” (1992) В. Зуёнак апелюе да біяграфій аўтарытэтных літаратурных папярэднікаў Купалы і Пушкіна, праводзіць аналогіі паміж заўчаснымі смерцямі беларускага і рускага нацыянальных геніяў; выяўляе містычную ўзаемаабумоўленасць іх лёсаў: “Калі ў вестыбюлі / Гасцініцы знатнай “Масква” / Хоць раз / Вы чулі / Ў гуле / Наезджым / Раптоўнае: / “А-а!..” – / То рэха Купалы, / Што з Чорнае рэчкі сюды / Ад Пушкіна прыблукала, / Звязала / Іх лёс / Праз гады... / У гулкую яму – / У лесвічны гэты развод – / Купалы / Купальскую драму / Дантэс, / як у чорную раму, / Штурхнуў, / У апошні палёт. / І лёд / Мармуровы / На маршах / прыступак цяжкіх / Цяплом дывановым, / Агнём пурпуровым / Цяпер не растопяць вякі. / Калоны, як свечкі, / Стаяць, / Ды не могуць свяціць, – / Як Чорная рэчка / Адмыцца не можа – / Ёй вечна Чорнаю быць” [5, с. 14]. Настрой верша-рэквіема, квінтэсенцыя змрочных адчуванняў паэта ў 1990-я гады, пашыраецца на ўсе творы кнігі “Чорная левіца” і ператвараецца ў рэквіем па нядаўна страчанай паэтам маці, па атручанай Чарнобылем Айчыне: “Чорная рэчка Пушкіна – чорная лесвіца Янкі Купалы – чорныя прыступкі лёсу. Яны вядуць у глыбіні нашай трагічнай гісторыі. Новая кніга Васіля Зуёнка прасякнута трагедыйным пафасам, паслячарнобыльскай трывогаю” [5, с. 101].

Трагедыйным пафасам прасякнуты таксама верш “Прадчуванне” (1998), у якім паэт разважае пра заўчасна абарваныя жыцці двух выбітных дзеячаў нацыянальнага адраджэння – Янкі Купалы і Максіма Гарэцкага:

То ўноч прымроіцца Гарэцкі,
То ўдзень – Купалаўскі пралёт…
І голас просіцца пагрэцца,
А ўсцяж і ўглыб – калымскі лёд.

Лёд – і на сэрцы, і ў краіне,
Дзе бог – вусаты вартавы…
І голас… – быццам ва ўспаміне,
Але як сённяшні, жывы…

Што ў гэтым голасе? І чый ён?
Ці гэта прадчуванне зор –
І лёс чырвонай Кампучыі
Занёс над геніем тапор?..”[28].

Разрозненыя алюзіі звязваюцца ў адзінае мастацкае цэлае матывам трывожнага прадчування – магчымасці паўтарэння крывавых эпізодаў беларускай савецкай і сусветнай гісторыі ў сённяшнім свеце.

У грамадзянскай лірыцы В. Зуёнка атрымлівае новае жыццё і сучасную інтэрпрэтацыю адзін з галоўных Купалавых вобразаў – вобраз прарока. Як вядома, у літаратурнай спадчыне Янкі Купалы гэты вобраз звязваецца з нацыянальна-адраджэнскай тэмай, яго мастацкае ўвасабленне палягае ў полі апазіцыі “відушчасць – невідушчасць”: паэт паўстае “відушчым” сярод нацыянальна “сляпога” народа [1, с. 19]. У многіх вершах Купалы робіцца акцэнт менавіта на “зрокавым” аспекце рэцэпцыі свету: “Я ў долю народа свайго *узіраюся* (вылучана намі. – *Н.З.*) / І толькі аб гэтым для вас тут пяю” [6, с. 54] (“Вы кажаце...”, 1906). У В. Зуёнка купалаўскі матыў “відушчасць – невідушчасць” з’яўляецца яшчэ ў 1960-я гг. і напачатку развіваецца ў сувязі з мастацкім даследаваннем экалагічнай тэмы. Так, за тры дзесяцігоддзі да чарнобыльскай трагедыі ў вершы “Ідуць дажджы” (1964) паэт змог “разгледзець” яе наступствы. У якасці эпіграфа да твора В. Зуёнак узяў радкі А. Блока “В последний раз – опомнись, старый мир!”. Анафарычная кампазіцыйная арганізацыя твора, паслядоўнае паўтарэнне слоў “Ідуць дажджы” стварае эфект ходу гадзінніка, які адлічвае час чалавечай цывілізацыі. “Ідуць дажджы. А травы жухнуць, / Грыбы хаваюцца ў зямлю. / Ідуць дажджы злавесна, глуха / Рунь заганяюць у раллю. / Ідуць дажджы. А птушкі млеюць / І нема падаюць на дол. / Ідуць дажджы... І ліст лілеі / Над смерцю рыб – хаўтурны стол” [3, с. 32]. У зуёнкаўскай лірыцы ўзнікае вобраз *вачэй прыроды*, зазірнуўшы ў якія мастак улавіў адзінае непаўторнае імгненне прыроднага адкрыцця (“откровения”) і аказаўся “асуджаным” на вечную занепакоенасць: “Прыходзіць жа аднойчы / Такая вышыня: / Глядзяць прыроды вочы / Штоночы і штодня. / Глядзяць табе насустрач, / Глядзяць табе наўслед. / І ты ўжо – невідушчы – / Бачыш цэлы свет” [4, с. 32] (“Непаўторнасць”).

Падобная “відушчасць” робіць паэта пасіянарыем і абавязвае вывесці іншых з духоўнай летаргіі. У такім выпадку літаратурная творчасць перастае быць толькі мастацтвам і ператвараецца ў творчасць сацыяльную, палітычную. Асабліва актуальна гэта ў дачыненні да асобы класіка, усё жыццё якога – узор адданага служэння Беларусі. Янка Купала дзеля вырашэння мастацкай (і – шырэй – грамадзянскай) задачы абуджэння нацыі выкарыстоўвае разнастайныя прыёмы; у

[28] Цытуецца па рукапісе В. Зуёнка.

паслярэвалюцыйных творах паглыбляюцца настроі расчаравання ў народзе, узнікае вобраз прарока і матыў чакання яго. Паэт зноў і зноў кліча суайчыннікаў “на сход”, будзіць нацыянальнае пачуццё (“Час!”, “На сход!”, “Свайму народу”):

Паўстань, народ! Прачніся, беларусе!
Зірні на Бацькаўшчыну, на сябе!
Зірні, як вораг хату і зямлю раструсіў,
Як твой навала злыдняў скарб грабе! <...>

Сваю магутнасць пакажы ты свету, –
Свой край, сябе ў пашане мець прымусь.
Паўстань, народ!.. З крыві і слёз кліч гэты...
Цябе чакае маці-Беларусь! [6, с. 257]

Вольная, незалежная дзяржава не ўяўляецца мастаку без уласных Прарока, Песняра, Ваякі, Уладара, якіх ніяк не дачакаецца Радзіма: “Паўстань з народу нашага, прарок, / Праяваў бураломных варажбіт, / І мудрым словам скінь з народу ўрок, / Якім быў век праз ворагам спавіт! / Збяры ў адну ўсю Беларусь сям’ю, / Вазьмі з яе прысягу і зарок, / Што не прадасць сябе, сваю зямлю... / Зняць путы Бацькаўшчыне ўстань, прарок!” [6, с. 276] (“Паўстань...”, 1919).

Праз дзесяцігоддзі, у новых гістарычных умовах да мастацкага асэнсавання праблемы нацыянальнага прарока звяртаецца В. Зуёнак. Прайшоў час, змяніліся пакаленні, але абазначанае класікам пытанне па-ранейшаму актуальнае. На думку сучаснага паэта, вялікая бяда Беларусі – адсутнасць нацыянальнага прарока, здольнага нарэшце раскрыць вочы людзям, дапамагчы пазбавіцца комплексу непаўнавартаснасці. Адным з лейтматываў лірыкі В. Зуёнка другой паловы 1990-х – пачатку 2000-х гг. становіцца чаканне прарока. У вершах “Сыне Божы, Хрыстос Ісусе...”, “Мы – у цэнтры, не на ваколіцы...” і інш. адчувальная арыентацыя на купалаўскую творчасць, відавочныя гіпертэкставыя адсылкі да спадчыны класіка. Некаторыя творы на гэтую тэму ў змястоўных і фармальных адносінах можна разглядаць як алюзіі на “малітвы” Купалы (“Мая малітва”: “Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...”, 1906; “Ва ўсяку мінуту, ва ўсякай патрэбе...”, 1912). Так, верш “Сыне Божы, Хрыстос Ісусе...” (2001) адкрываецца эпіграфам “Паўстань з народа нашага, прарок...”. В. Зуёнак звяртаецца да Бога з пакутнай просьбай выратаваць Беларусь, падараваць ёй сапраўднага Месію:

Сыне Божы, Хрыстос Ісусе,
Ці ты нас не пабачыў здалёк,
Што да грэшнай маёй Беларусі
Не дайшоў ні адзін твой прарок?... <...>

Божа светлы, Божа адзіны,
Дай хоць сёння нам ласку сваю:
У імя пакутнай Радзімы,
Дай нам, Божа, прарока, –
малю [5, с. 110–111].

Разам з тым паэт бачыць, што беларус застаецца ўсё такім жа пасіўным, інертным, абыякавым да сябе самога, да сваёй будучыні, і гэта нараджае змрочныя

настроі і матывы расчаравання: “Будзе новы дзень – і далёкія / Не паклічуць нас небасхілы. / Нашы крылы растануць аблокамі, / Мы – гарбатыя, як магілы. / Будзе зноў кумір новаспечаны / Нас прымерваць да ўласнага кроку. / А бяда наша – звышчалавечая: / Беларусь не чакае прарока...” [2, с. 10] (“Будзе новы дзень...”, 1997). Зрэдку аўтар сам сябе называе прарокам, але “бяздомным, бязмоўным”, слова якога так і не здолела абудзіць народ. У шматлікіх вершах апошніх дзесяцігоддзяў вобраз паэта ўзвышаецца, набывае рысы прарока, слова яго гучыць важка, як запавет (“Нарадзіўся – значыць, у вечнасць прыйшоў...”, “З народам, як з лёсам сваім...”, “Не быў беларусам...”). Зуёнкавы вершы, у якіх увасабляецца вобраз прарока, па вастрыні і сіле гучання, палемічнаму напалу, драматычнаму пафасу не саступаюць вершам класіка.

Як уяўляецца, у мастацка-вобразным свеце В. Зуёнка месца нацыянальнага прарока справядліва адводзіцца Купалу. Выключная асоба класіка бачыцца паэту адной з галоўных першаасноў, на якіх трымаецца беларуская духоўнасць: “Аб адным, Божа мой, / Малю – / Дай апору ў сусветнай гонцы: / Беларускаму плугу – / Зямлю. / І Купалавай хаце – / Сонца!..” [5, с. 97–98] (“Аб адным, Божа мой...”, 1998). Невыпадкова творы купаліяны складаюць значную частку лірычнага набытку В. Зуёнка, выяўляючы ідэйна-творчыя арыенціры, мастакоўскія густы і грамадзянскую пазіцыю паэта.

**Літаратура**


1. Гоўзіч, І. Насустрач святлу: праблема прасвятлення народа ў творчасці Янкі Купалы і Янкі Сіпакова / І. Гоўзіч // Роднае слова. – 2003. – № 7. – С. 17–21.
2. Зуёнак, В. Вершы / В. Зуёнак // Полымя. – 1998. – № 6. – С. 3–17.
3. Зуёнак, В. Выбраныя творы / В. Зуёнак. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 512 с.
4. Зуёнак, В. Світальныя птушкі : вершы і паэма / В. Зуёнак. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 159 с.
5. Зуёнак, В. Чорная лесвіца: вершы і паэма / В. Зуёнак. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 159 с.
6. Купала, Я. Выбраныя творы / Я. Купала. – Мінск : Кнігазбор, 2002. – 640 с.



***А. А. Манкевіч***


## РАЗВІЦЦЁ КОЛАСАЎСКАЙ АСВЕТНІЦКАЙ ТРАДЫЦЫІ Ў АПАВЯДАННЯХ ГЕНРЫХА ДАЛІДОВІЧА

У другой палове XX стагоддзя ў беларускім літаратуразнаўстве дыскусіі на тэму пісьменніцкага майстэрства і стылю, традыцый і наватарства, вяліся даволі часта. Г. Далідовіч якраз з тых пісьменнікаў, чыё імя фігуравала ў гэтых дыскусіях, і разам з тым, варта адзначыць, што гэта пісьменнік, які ніколі не прытрымліваўся зменлівай моды. Галоўнымі для яго заўсёды былі сацыяльная актыўнасць і інтэлектуальная змястоўнасць мастацкага слова. Сваёй творчай задачай ён лічыў развіццё і ўзбагачэнне нацыянальнага хранатопу новым сэнсам і значэннем. Інакш кажучы, імкнуўся праз новае і нетрадыцыйнае паказваць вечную вартасць традыцыйнага, класічнага, развіваць і па-сучаснаму тлумачыць тое, што было пачата Коласам, Гарэцкім, Чорным, Мележам. Не выпадкова ў прыхільнасці да творчага вопыту пералічаных майстроў слова Генрых Далідовіч неаднаразова